# 2 жніўня 2024 г. - 80 гадоў з часу заснавання швейнай фірмы «Лона» – філіяла ААТ «Магатэкс» у г. Кобрыне (1944), прадпрыемства па вытворчасці адзення




Працоўная біяграфія Кобрынскай швейнай фабрыкі бярэ пачатак з 2 жніўня 1944 года, калі была ўтворана швейная майстэрня-арцель «Сацыялістычная праца». Адкрылася яна ў памяшканні былых гандлёвых радоў, пабудаваных яшчэ да вайны. Загадам № 1 ад 2 жніўня 1944 года старшыня арцелі таварыш Ганвергер прыняў на працу першых швачак.

Арцелі было перададзена некалькі трафейных швейных машын фірмы «ZINGER», выкарыстоўваліся таксама асабістыя швейныя машыны работнікаў. Першы калектыў швейнай майстэрні налічваў 19 чалавек: загадчык вытворчасці, 12 швачак і 6 краўцоў. Усе працы праводзіліся ўручную, прадукцыйнасць была нізкай. Да вясны 1945 г. арцель вырабляла ў асноўным прадукцыю для фронту - целагрэйкі, ватныя штаны, коўдры.

У студзені 1950 года старшынёй арцелі і пасля першым дырэктарам Кобрынскай швейнай фабрыкі стаў Іван Антонавіч Косінаў. У тым жа годзе на фабрыцы ўстаноўлена 10 швейных машын 22-га класа, якія працавалі на адным электрапрывадзе. З 1953 года пачата ўкараненне больш дасканалага ўніверсальнага і спецыяльнага абсталявання. Складаную працу работніц часткова аблегчылі спецмашыны і аўтаматы. У 1954 годзе пасля заканчэння Мінскага тэхналагічнага тэхнікума на фабрыку прыбылі першыя дыпламаваныя спецыялісты.

У 1956 годзе арцель перададзена Міністэрству лёгкай прамысловасці БССР і перайменавана ў швейную фабрыку. Працавала 256 чалавек. Пашывачны асартымент — касцюмы для дзяцей з бавоўняных і шарсцяных тканін.

У 1961—1966 гадах праведзена рэканструкцыя фабрыкі з пашырэннем плошчаў. У 1967 годзе ўведзены ў эксплуатацыю новы трохпавярховы вытворчы корпус, у якім размясціліся два пашывачныя, раскройныя, падрыхтоўчыя цэхі з новым айчынным і імпартным абсталяваннем. Колькасць рабочых узрасла да 1300 чалавек.

Ішоў час, аб'ёмы вытворчасці нарасталі, а разам з імі набірала абароты і прадпрыемства. У студзені 1972 года фабрыку ўзначаліў Міхаіл Валенцей. Пачалося асваенне новага асартыменту — куртак спартыўна-бытавога прызначэння для ўсіх узроставых груп. Частку мадэляў распрацоўваў Беларускі цэнтр моды ў Мінску, частка распрацоўвалася на прадпрыемстве.

У лютым 1974 года дырэктарам прадпрыемства назначаны Уладзімір Вікенцьевіч Качан, пад кіраўніцтвам якога на працягу 20 гадоў ішло станаўленне фабрыкі. На час яго кіраўніцтва выпала перабудова, распад Савецкага Саюза, пераход на рынычную эканоміку. У студзені 1994 года яго змяніў на пасадзе Міхаіл Іванавіч Кірылюк. Прыйшоўшы на швейную фабрыку ў якасці слесара-рамонтніка, на працягу 10 гадоў ён паспяхова ўзначальваў «Лону».

Прадпрыемства не раз змяняла назву. У 1993 годзе Кобрынская швейная фабрыка стала арэндным прамыслова-гандлёвым прадпрыемствам «Лона», у 1994 годзе перайменавана ў Кобрынскую швейную фірму «Лона», з 1999 года стала ўнітарным прадпрыемствам «Кобрынская швейная фірма», з чэрвеня 2001 года атрымала статус рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Швейная фірма "Лона" канцэрна "Беллегпрам"».

У гады распаду СССР і чарады эканамічных крызісаў «Лона» шукала выхады і знаходзіла іх. У тыя складаныя гады на прадпрыемстве асвоілі імпартны асартымент прадукцыі, а ў ліку дзелавых партнёраў фірмы Францыі, Польшчы, Чэхіі, Галандыі і інш.

З мая 2006 года і па сённяшні дзень швейная фірма паспяхова працуе пад кіраўніцтвам Зінаіды Васільеўны Андрэюк. У кастрычніку 2009 года швейная фірма «Лона» канцэрна «Беллегпрам» пераўтворана ў адкрытае акцыянернае таварыства «Швейная фірма "Лона"». Прадпрыемства на 100% змяніла асартымент прадукцыі, канструктары займаліся канцэптуальнымі распрацоўкамі новага дызайну, эксперыментавалі, шукалі самыя модныя тэндэнцыі. 2009 год быў адзначаны чарговай хваляй мадэрнізацыі, калі ў рамках падрыхтоўкі да рэспубліканскага фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі «Дажынкі»», які праводзіўся ў Кобрыне, быў выкананы сучасны рамонт памяшканняў, абноўлена абсталяванне, пашыраны асартымент, аснову якога складала верхняе адзенне рознага

прызначэння, 67% у агульным аб'ёме прадукцыі займалі мадэлі для дзяцей. Прадпрыемства таксама выпускала прадукцыю на давальніцкай сыравіне для прадпрыемстваў-заказчыкаў.

З 1 лістапада 2017 года ААТ «Швейная фірма “Лона”» рэарганізавана ў форме далучэння яго да ААТ «Магатэкс» у філіял адкрытага акцыянернага таварыства «Магатэкс» у г. Кобрыне. У асартыменце прадукцыі, што выпрабляецца ў філіяле, вялікую ўдзельную вагу займае спецадзенне для мноства спецыяльнасцей, работа якіх звязана з прафесійнымі рызыкамі - лётчыкаў, нафтавікоў, металургаў, будаўнікоў, шахцёраў і іншых. Асноўны заказчык – кампанія «Техноавиа» «Тэхнаавія» – адзін з вядучых расійскіх распрацоўшчыкаў спецвопраткі, ахоўнага абутку і сродкаў індывідуальнай абароны.

На працягу дзесяцігоддзяў за якасць прадукцыі швейная фірма «Лона» атрымлівае ўзнагароды самага высокага ўзроўню, прычым як у нашай краіне, так і далёка за яе межамі, неаднаразова станавілася лаўрэатам конкурсу «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь». Дзякуючы прафесіяналізму, адказнасці і працавітасці калектыву дасягаюцца ўсё новыя і новыя рубяжы.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2024 г. Кобрынскай
цэнтральнай раённай бібліятэкай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I катэгорыі
аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Андреюк, З. В.** Кобринская швейная фирма «Лона» / З. В. Андреюк // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. – Минск, 2009. – Кн. 1. – С. 467-468.

**Кобринская швейная фабрика** // Белорусская ССР : краткая энциклопедия : [в 5 т.]. - Минск, 1979. – Т. 2. – С. 285.

**Кобрынская швейная фабрыка** // Беларуская энцыклапедыя : кароткая энцыклапедыя : [у 5 т.]. – Мінск, 1979. – Т. 2. - С. 348.

**Рэспубліканскае** ўнітарнае прадпрыемства «Кобрынская швейная фірма “Лона”» // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. Мінск, 2002. С. 411.

**Государственные** промышленные предприятия. Швейная фирма «Лона» // Кобрин : информационно-хозяйственный справочник. – Кобрин, 1999. - С. 45.

**Кобринская швейная фабрика** // Справочник предприятий и организаций СССР : текстильная, лёгкая и смежные отрасли промышленности. – Ленинград, 1991. – С. 56.

**Андреюк Зинаида Васильевна** : [с 2006 г. З. В. Андреюк – директор ОАО «Швейная фабрика “Лона”»] // Кто есть кто в Республике Беларусь. Женщины Беларуси. – Минск, 2011. – Т. 1. – С. 11 : фот.

**Промышленность** Кобрина : [буклет]. – Минск : Полымя, 1987.

**#Равнение** на героев. Одежда хорошего настроения / подготовила Жанна Елизарова по материалам Кобринского военно-исторического музея им. А. В. Суворова, ГУ «Зональный архив в г. Кобрине» и фондов предприятия // Кобрынскі веснік. - 2023. — 26 жніўня (№ 56). — С. 14—15 : фот.

История образования и развития Кобринской швейной фабрики.

**Бакун, Е.** Предприятие с историей / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2023. — 29 ліпеня (№ 52). — С. 5 : фот.

О работе филиала ОАО "Моготекс" в городе Кобрине.

**Бакун, Е.** Швейных дел мастерицы / Елена Бакун ; фото Елена Бакун // Кобрынскі веснік. – 2021. – 12 чэрвеня (№ 46). – С. 1, 2 : фот.

О работе филиала ОАО «Моготекс» в городе Кобрине.

**Бакун, Е.** Профессия — швея / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2018. — 9 чэрвеня. — С. 1, 2.

Наметились положительные тенденции в результате присоединения швейной фирмы «Лона» к предприятию «Моготекс».

**Сергеев, И**. Швейная модернизация / Иван Сергеев // Заря. - 2018. — 16 июня. — С. 2.

Филиал могилевского ОАО «Моготекс» в г. Кобрине модернизирует производство.

**Андреюк, З. В.** "Лона" и "Моготекс" — взаимовыгодное сотрудничество / [Зинаида Андреюк ; беседовала] Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2017. — 8 июня. — С. 4.

**Бакун, А.** Будучае — за стабільнасцю і ўпэўненасцю / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. — 27 снежня. — С. 5.

Змены, згодна з якімі "Лона" стала філіялам ААТ "Магатэкс", даюць надзеі на дзень заўтрашні.

**Бялоў, Д.** Рэзервная, лепшая, наша! / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2017. — 10 чэрвеня. — С. 2.

Рэзервная швачка М. Ільчук швейнай фабрыкі "Лона" заняла другое месца на рэспубліканскім конкурсе прафесіянальнага майстэрства.

**Елизарова, Ж.** Швейная фирма "Лона": с мыслями о весне / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2017. — 20 верасня. — С. 2.

К началу учебного года ОАО "Швейная фирма "Лона" поставило 3100 единиц одежды делового стиля для девочек-школьниц.

**"Лона"** присоединяется к "Моготекс" // Кобрин-информ. - 2017. — 13 апреля. — С. 2.

**"Лона"** реорганизуется // Кобрынскі веснік. - 2017. — 12 красавіка. — С. 4.

**Можаровская, Е.** Текстильно-швейный альянс / Елена Можаровская // Вечерний Брест. - 2017. — 14 апреля. — С. 5.

Швейная фирма "Лона" станет филиалом могилевского ОАО "Моготекс".

**От "Лоны"** до "Моготекса" // Кобрынскі веснік. - 2017. — 27 верасня. — С. 2.

Швейная фірма "Лона" переживает новый этап своего развития.

**Дубіна, Л.** "Лона" - значыць якасць / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2016. — 20 ліпеня. — С. 4.

Больш чым 70 гадоў існуе ў г. Кобрыне ААТ «Швейная фірма "Лона"».

**Пашкович, Л**. Школа № 9 "оделась" в форму от "Лоны" / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2016. — 3 верасня. — С. 4.

ОАО «Швейная фирма "Лона"» изготовила семь моделей школьной формы для учащихся младших классов.

**Белов, Д**. "Одежда хорошего настроения" / Дмитрий Белов ; фото автора // Кобрынскі веснік. - 2014. — 3 снежня. — С.3.

**Бялоў, Д.** Прыходзьце за абноўкамі! / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. – 2014. – 19 ліпеня. – С. 10.

ААТ «Швейная фабрыка «Лона»: гісторыя, сучаснасць.

**Бялоў, Д.** "Лона" прымае віншаванні / Дзмітрый Бялоў ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2014. — 14 чэрвеня. — С. 2.

Швейная фабрыка «Лона» адзначыла 70-гадовы юбілей.

**Кондрашук, Н.** Поверил ПРООН / Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. - 2014. —20 февраля. — С. 2.

В республиканском конкурсе информационных материалов рекламного характера одним из победителей стал инженер-программист швейной фабрики "Лона" Игорь Алексейчук.

**Савчук, М**. «Лона» - одежда хорошего настроения / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. – 2014. - 12 июня. – С. 3.

ОАО «Швейная фирма «Лона» успешно постигает законы моды 70 лет.

**У кобринской** "Лоны" юбилей // Кобрынскі веснік. - 2014. — 6 июня. — С. 1.

Крупнейший производитель верхней одежды ОАО «Швейная фирма "Лона"» отмечает 70-летний юбилей.

**Бялоў, Д.** Зінаіда Андраюк: "У кіраўніка не можа быць любімых і нелюбімых супрацоўнікаў" / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2011. - 5 сакавіка. - С. 2.

Аб кіраўніку ААТ «Швейная фабрыка "Лона"» З. Андраюк.

**Ещё** один фирменный // Вечерний Брест. - 2011. - 16 декабря. - С. 1 ; Заря. - 2011. - 24 декабря. - С. 2 ; Кобрынскі веснік. - 2011. - 24 снежня. - С. 2.

**Льняная** коллекция из Кобрина // Кобрин-информ. - 2011. - 13 января. - С. 2.

Швейная фирма «Лона» планирует наладить производство льняных вещей.

**Модернизация** производства швейной фирмы "Лона" продолжена // Кобрин-информ. - 2011. - 6 января. - С. 2.

**Волков, С.** Швейная модернизация / Сергей Волков // Заря. - 2010. - 23 декабря. - С. 2.

**Чебоксарова, М.** Одежда хорошего настроения / Мария Чебоксарова // Кобрынскі веснік. - 2010. - 1 снежня. - С. 4.

**Чебоксарова, М.** С новой техникой - новые возможности / Мария Чебоксарова // Кобрынскі веснік. - 2011. - 19 студзеня. - С. 2.

Швейная фирма «Лона»расширяет свой ассортимент.

**Бялоў, Д.** Адметная рыса "Лоны" / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2009. - 17 верасня. - С. 8.

Швейнай фірме “Лона” – 65 год.

**Белов, Д.** Основное кредо - качество / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2008. - 9 ліпеня. - С. 2.

Швейная фирма “Лона”.

**Жук, Е.** «Лона» готова к весне-2009 / Елена Жук // Вечерний Брест. - 2008. - 3 октября. - С. 2.

**Квартальная, И.** На подиуме - "Лона"! / Ирина Квартальная // Кобрынскі веснік. - 2008. - 4 кастрычніка. – С. 3.

**Квартальная, И.** Одежда "Лона": стильно и комфортно! / Ирина Квартальная // Кобрынскі веснік. - 2008. - 29 кастрычніка. - С. 2.

**Курига, Е.** "Лона" шагнула в весну / Елена Курига // Кобрин-информ. - 2008. - 23 октября. - С. 3.

**Мельнік, Р**. "Лона" - гучны брэнд / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2007. - 12 декабря. - С. 1.

**Высокое** искусство модельеров // Кобрынскі веснік. – 2006. – 18 сакавіка. – С. 2.

**«Лона»** на рубеже успехов и задач // Кобрин-информ. – 2004. – 12 августа. – С. 2.

60-летний юбилей «Лоны».

**Пянко, А.** Юбилей, который обязывает / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 2004. – 4 жніўня. – С. 1,2.

Швейной фабрике “Лона” – 60.

**Пянко, А**. «Лона» трымае марку / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 1997. – 28 мая. – С. 3.

**Итальянские** военные носят мундиры, пошитые в Кобрине // Заря. – 1997. – 14 января. – С. 1.

Кобринская фирма «Лона» подписала ряд выгодных контрактов с Францией, Италией, Чехией.

**Стрелковский, В.** Кобрин – это меж Парижем и Москвой / В. Стрелковский // Советская Белоруссия. – 1993. – 26 февраля. – С. 2.

Кобринская швейная фабрика заключила контракт с американской фирмой.

**Петрукович, М.** По заказу канадской фирмы / М. Петрукович // Заря. – 1989. – 15 ноября.

Кобринская швейная фабрика расширяет выпуск продукции на экспорт.

**Суворов, А.** На любой вкус / А. Суворов // Советская Белоруссия. – 1984. – 15 декабря.

О продукции Кобринской швейной фабрики.

**Качан, В.** Слагаемые трудовой активности / В. Качан // Промышленность Белоруссии. – 1984. - № 1. – С. 26-27.

Директор Кобринской швейной фабрики В. Качан – о предприятии.

**Гардзіевіч, Н.** Урачыстае святкаванне / Н. Гардзіевіч // Камуністычная праца. – 1974. – 13 жніўня.

Кобрынскай швейнай фабрыцы – 30 год.

***Рэгіён:***

Кобрынскі раён

Кобрын

***Установы:***

Кобрынская швейная фабрыка

***Прадметы:***

Фабрыкі

Прадпрыемствы